# Да ўсіх рабочых, колгасьнікаў і ўсяго працоўнага насельніцтва Койданаўскага раёну

## З адозвы прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Кам!тэту і Савету Народных Камісараў БССР

**Таварышы!**

Савецкая Беларусь, уваходзячы ў Саюз ССР, зьяўляецца неадрыўнай яго часткаю. Працоўныя масы БССР разам з працоўнымі масамі ўсяго Савецкага саюзу пад кіраўніцтвам партыі Леніна, на падставе генэральнай лініі комуністычнай партыі пасьпяхова будуюць социялізм. Рост рэволюцыйнай актыўнасьці працоўных мас, якая знаходзіць сваё выяўленьне ў шырока разгорнутым соцспаборніцтве і ўдарніцтве, выяўляе новыя нявычэрпныя крыніцы творчага энтузіязму і самаадданасьці справе соцыялізму ў самых шырокіх колах працоўных.

Крок за крокам, у цесным саюзе і пры падтрыманьні ўсяго Саюзу ССР, Савецкая Беларусь—заходні форпост Савецкага саюзу—пасьпяхова перамагае эканамічную і культурную адсталасьць—спадчыну царызму, з краіны зацянай, някультурнай у мінулым, ператвараецца ў краіну індустрыяльна-колгасную, у краіну суцэльнай пісьменнасьці, з краіны спажывецкай—у краіну высока-таварнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

Посьпехі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва Савецкай Беларусі зьяўляюцца яскравым прыкладам правільнасьці ленінскай нацыянальнай політыкі, якая пасьлядоўна ажыцьцяўляецца ў Савецкім саюзе.

Працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй, якія насяляюць Савецкую Беларусь, у тым ліку польская нацыянальнасьць, цьвёрда і беспаваротна сталі на шлях соцыялізму і пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі вядуць нясупынную барацьбу на фронце вялікай соцыялістычнай будоўлі, перамагаючы ўсякае супраціўленьне клясавых ворагаў, вядучы бязьлітасную барацьбу з правым опортунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» опортуністымі і з усімі прымірэнцамі. Польскія рабочыя, разам з усёй рабочаю клясай вялікай Савецкай краіны ажыцьцяўляючы дыктатуру пролетарыяту, пасьпяхова змагаюцца за выкананьне пяцігадовага пляну, за пабудову бясклясавай соцыялістычнай грамады.

Бязупынна, на базе нябачаных тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі няўхільна павышаецца экономічны і культурны ўзровень працоўных мас.

У процілегласьць капіталістычнаму сьвету Савецкі саюз праводзіць пасьлядоўна і няўхільна політыку міру, выкрываючы падпальшчыкаў новай імпэрыялістычнай вайны.

Таварышы рабочыя, колгасьнікі, бедякі, серадзякі і ўсе працоўныя Койданаўскага раёну! Савецкая Беларусь разам з усім Савецкім саюзам закончыла выкананьне першай пяцігодкі, заканчвае выкананьне пляваў 4-га заключнага году.

Каб спраўна падрыхтавацца да другой пяцігодкі, працоўныя ўсяго Савецкага саюзу і працоўныя Койданаўскага раёну павінны мобілізаваць усе свае сілы на пасьпяховае вырашэньне задач бягучага, заключнага году першай пяцігодкі.

Мы знаходзімся ў паласе вясеньняй сяўбы. Пасьпяховае вырашэньне трэцяй бальшавіцкай вясны мае вялізарнае політычнае і гаспадарчае значэньне. Таму пасьпяховае выкананьне пляваў вясеньняй сяўбы зьяўляецца політычным экзаменам для кожнага колгасу, саўгасу, для ўсяго бядняцкага і серадняцкага сялянства і вымагае ад нас напружанай работы.

Вырашэньне ўсіх гэтых задач мажліва толькі на падставе далейшага разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, крытыкі і самакрытыкі на падставе рашучага ажыцьцяўленьня 6 гістарычных умоў т. Сталіна, на падставе згуртаваньня ўсіх працоўных вакол комуністычнае партыі.

Напружанасьць міжнародных абставін, пагроза новай імпэрыялістычнай вайны, накіраванай у першую чаргу супроць Савецкага саюзу, прымушае нас з асаблівай уважлівасьцю адносіцца да справы ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны саветаў і ўзмацненьня баяздольнасьці нашай Чырвонай арміі.

Таварышы! 27 красавіка адкрываецца зьезд саветаў Кой-

**З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы**